Бездольная М.А., студент 450 группы
дневной формы обучения
Научный руководитель – Бомбешко И.И.,
кандидат культурологии, доцент кафедры

# МЕМАРЫЯЛЬНЫ КОМПЛЕКС «ХАТЫНЬ» ЯК ПРЫКЛАД АКТУАЛІЗАЦЫІ ГІСТАРЫЧНАЙ ПАМЯЦІ

Мемарыяльны комплекс «Хатынь» – сімвал трагедыі беларускага народа, помнік драматычнай старонцы Вялікай Айчыннай вайны, які быў узведзены ў памяць аб загінуўшых жыхарах Беларусі.

Калі ўзяць карту краіны і паспрабаваць знайсці гэтую вёску, то ні на адной, нават самай падрабязнай яна не пазначана, паколькі была знішчана фашыстамі 22 сакавіка 1943 г. Як памяць аб загінуўшых 2.230.000 жыхарах Беларусі, у 1969 г. на месцы спаленай разам з жыхарамі вёскі Хатынь быў збудаваны мемарыяльны комплекс, у якім увасоблена ідэя мужнасці і непакоранасці народа, што перанёс незлічоныя ахвяры ў імя перамогі.

У дзень трагедыі недалёка ад Хатыні партызанамі была абстраляна аўтакалона фашыстаў і быў забіты нямецкі афіцэр. У адказ карнікі акружылі вёску, сагналі ўсіх жыхароў у хлеў і падпалілі яго, а тых, хто спрабаваў бегчы, расстрэльвалі з аўтаматаў і кулямётаў. У час карнай аперацыи загінула 149 чалавек, з іх 75 дзяцей ва ўзросце да 16-ці гадоў. Вёска была разрабавана і поўнасцю спалена. Падчас трагедыі выжылі толькі шэсць чалавек. Траім дзецям, Валодзю і Соні Яскевічам, Саш уЖалабковічу, удалося схавацца ад гітлераўцаў. Засталіся жывыя двое дзяцей з тых, хто знаходзіўся ў хляве: Віктар Жалабковіч і Антон Бараноўскі. Адзіным дарослым сведкам Хатынскай расправы стаў 56-гадовы вясковы каваль Іосіф Камінскі, які знайшоў свайго сына сярод загінуўшых аднавяскоўцаў. Хлопчык быў смяротна паранены ў жывот, атрымаў моцныя апёкі і памёр на руках у бацькі [4].

Да 1964 на месцы спаленай вёскі стаяў сціплы абеліск, аднак гісторыя не захавала для нас абставіны ўзвядзення гэтага помніка.

Рашэнне аб будаўніцтве мемарыяла было прынята ў 1966 г., ініцыятарам стварэння якога быў першы сакратар ЦК КП(б)Б БССР П. М. Машэраў. У сакавіку 1967 г. быў аб'яўлены рэспубліканскі конкурс, на які было пададзена каля 10-12 заявак. Перамог калектыў архітэктараў, сярод якіх былі ужо вядомыя архітэктары Ю. М. Градаў, В. П. Занковіч, Л. М. Левін і народны мастак БССР, скульптар С. І. Селіханаў, якія ўжо мелі вопыт стварэння помнікаў на ваенную тэматыку [2].

Узгадваючы працэс стварэння мемарыяла, вядомы архітэктар Л. М. Левін адзначаў: «Работа над проектом захватила нас. Мы придумали венцы срубов на месте бывших домов, обелиски в виде печных труб, но чего-то не хватало. Заросшее травой поле, свидетель трагедии, хранило мертвую тишину. И вдруг в этой щемящей душу тишине неожиданно запел жаворонок. Звук! Тут должен быть звук». Менавіта так нарадзілася ідэя званоў Хатыні, якія гучаць над усім мемарыялам [1].

Да канца 1968 г. мемарыяльны комплекс быў гатовы, аднак на яго адкрыцці першы намеснік Старшыні Савета Міністраў СССР К. Т. Мазураў заўважыў, што для ўзмацнення эмацыянальнага эфекта і захавання гістарычнай памяці неабходна гэты архітэктурны аповед дапоўніць расказам аб іншых спаленых вёсках Беларусі. Аднак першапачатковая ідэя ўзвесці непадалёк ад Хатыні яшчэ адзін комплекс не была падтрымана. Таму было прынята рашэнне ў адным мемарыялу спалучыць драматычныя лёсы ўсіх спаленых фашыстамі беларускіх вёсак. На дапрацоўку аўтарам быў адведзены год [2].

Урачыстае адкрыццё Мемарыяльнага комплексу «Хатынь» адбылося 5 ліпеня 1969 г. Адкрыццё было прымеркавана да 25-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Да комплексу скрозь лес вядзе пяцікіламетровая дарога, акружаная лясамі. Мармуровыя маналіты нібы адлічваюць кожны яе кіламетр. Сам архітэктурна-гістарычны ансамбль размясціўся на плошчы ў 50 га. У самым цэнтры ўзвышаецца помнік «Непакоранаму чалавеку», які паказвае знямоглага пажылога чалавека са

сваім загіўшым сынам на руках. Стаіць ён у асяроддзі гранітных пліт, сімвалічна ўзнаўляюць дах палаючага хлява. Тут магіла з белага мармуру, на якой высечаны словы – свайго роду зварот тых, хто загінуў: «Люди добрые, помните: любили мы жизнь и Родину нашу, и вас, дорогие. Мы сгорели живыми в огне. Наша просьба ко всем: пусть скорбь и печаль обратятся в мужество ваше и силу, чтобы смогли вы утвердить навечно мир и покой на Земле. Чтобы отныне нигде и никогда в вихре пожаров жизнь не умирала!». З другога боку вянка – адказ жывых загінуўшым: «Родные вы наши. Головы в скорби великой склонив, стоим перед вами. Вы не покорились фашистским убийцам в черные дни лихолетья. Вы приняли смерть, но пламя любви вашей к Родине нашей Советской вовек не погаснет. Память о вас в народе бессмертна, как вечна земля и вечно яркое солнце над нею!» [3].

Да помніка вядзе былая вуліца вёскі – цяпер шырокая алея з жалезабетонных плітаў. 26 попельных падмуркаў уяўляюць сабой дамы жыхароў, над кожным высіцца труба печы, а таксама шыльды з імёнамі тых, хто тут калісьці жыў. Кожная хата Хатыні вянчаецца званом, які звініць кожныя 30 секунд разам з суседскімі. Перад кожным з дамоў ўстаноўлена брамка, як знак гасціннасці. 185 магіл сімвалізуюць 185 спаленых фашыстамі вёсак Беларусі. Кожная вёска выканана ў выглядзе папялішча з полымем ў самым цэнтры і з урнай, у якой захоўваецца зямля, прывезеная з кожнай вёскі. Кожная магіла на гэтых сімвалічных могілках мае назву і раён месцазнаходжанняспаленай вёскі.

Яшчэ адзін мемарыяльны элемент хатынскага комплексу – Дрэва жыцця, на галінках якога ў алфавітным парадку пералічаны назвы 433 беларускіх вёсак, спаленых акупантамі разам з жыхарамі, але адноўленых пасля вайны. На мемарыяльнай сцяне памяці ўстаноўлены памятныя пліты з назвамі 260 лагераў смерці і месцаў, дзе фашысты масава знішчалі на тэрыторыі Беларусі людзей. У памяць аб загінуўшых гарыць Вечны агонь.

Кожны з элементаў хатынскага мемарыяла мае сваю сімволіку, у якой заключаны глыбокі сэнс і арыгінальнае вырашэнне перажытай жыхарамі

нашай краіны ў гады Вялікай Айчыннай вайны трагедыі, непакорлівасці і мужнасці беларускага народа. Кожны год у дзень памяці ахвяр Хатыні тут праходзіць мітынг-рэквіем. Наведванне мемарыяла вымушае людзей усвядоміць крохкасьць міру, задумацца пра каштоўнасць чалавечага жыцця.

Мемарыяльны комплекс «Хатынь» уключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурнай спадчыны [6].

У Хатынь едуць людзі з розных краін, каб аддаць даніну памяці ўсім загінуўшым у полымі вайны. За гады існавання гэтага елічнага архітэктурна-мастацкага ансамбля яго наведалі каля 40 млн чалавек больш чым са 100 краін свету. Сярод ганаровых наведвальнікаў мемарыяла – вядомыя палітыкі, палітычныя дзеячы: ФідэльКастра, Ясір Арафат, Рычард Ніксан, Раджыў Гандзі, Мауна Койвіста, Ху Цзінтаа і інш[5].

Хатынь дае чалавецтву просты і мудры ўрок: людзі павінны памятаць пра тое, што было, каб не паўтараць такія трагедыі зноў. Хатынь не забыта. Наадварот, сёння яе ведае ўвесь свет. Дваццаць шэсць званоў звоняць над былой вёскай. Звоняць у любую пару года. Звоняць ноччу і днём. Звоняць, нагадваючы пра мінулае... А забыць мінулае – значыць страціць будучыню.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. Архитектор Градов о Хатыни і о том, как Машеров передвигал курган Славы [Электронный ресурс] // Новостное агентство Sputnik. Беларусь. – Режим доступа: https://sputnik.by/20180213/arhitektor-gradov-o-hatyni-i-o-tom-kak-masherov-peredvigal-kurgan-slavy-1033596693.html?ysclid=lf2cdpclj3181523339. – Дата доступа 28.02.2023
2. Государственное учреждение «Государственный мемориальный комплекс «Хатынь» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://khatyn.museum.by/. – Дата доступа 03.03.2023
3. Мемарыял «Хатынь» [Электронный ресурс] // Belarus.by. – Режым доступа: https://www.belarus.by/by/travel/belarus-life/khatyn/ – Дата доступа 10.03.2023.

4. Мемориальный комплекс «Хатынь» [Электронный ресурс] // Недвижимость в Минске. – Режим доступа:https://www.hata.by/articles/memorialnyj_kompleks_hatyn-9107/?ysclid=letswr80ex140161478. – Дата доступа 27.02.2023

5. Символ трагедии. Мемориальный комплекс «Хатынь» [Электронный ресурс] // Лельчицы. Свежие новости. – Режим доступа:https://www.lelchitsy.by/2018/03/dose-simvol-tragedii-memorialnyj-kompleks-xatyn/?ysclid=lf2c6190aq668871260. – Дата доступа 04.03.2023

6. Хатынь – Мемориальный ансамбль в память о сожжённых деревнях [Электронный ресурс] // Архитектурные сооружения мира. – Режим доступа: https://architectureguru.ru/the-memorial-complex-khatyn/?ysclid=lette0q49z285876368. – Дата доступа 28.02.2023

Белановская А.А., магистрант
заочной формы обучения
Научный руководитель – Смолик А.И.,
доктор культурологии, профессор

## ЦИФРОВИЗАЦИЯ ИЗОБРАЗИТЕЛЬНОГО ИСКУССТВА (НА МАТЕРИАЛАХ УЧРЕЖДЕНИЯ ОБРАЗОВАНИЯ «МИНСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ХУДОЖЕСТВЕННЫЙ КОЛЛЕДЖ ИМЕНИ А.К. ГЛЕБОВА»)

В связи с необходимостью учета большого объема работ, сокращения времени подготовки тематических выставок, облегчения поиска работ в хранилищах, а также обеспечения доступа к просмотру работ более широкому кругу заинтересованных лиц возникла необходимость разработки базы данных дипломных работ УО «МГХК имени А.К. Глебова» в цифровом виде. Автоматизация повышает производительность труда, сокращает время выполнения процесса, увеличивает точность и стабильность выполняемых операций. Все вышеуказанные задачи решает создание автоматизированной